18 апреля, 19:26, Абрам *В. Тучкова тут обзывали разными словами и, кажется, вполне заслуженно. Что касается этого материала, то он превзошел сам себя. Лукашенко является гарантом того, чтобы белфашики не пришли к власти. Об этом надо всегда помнить.*

18 апреля, 19:29, Винни *А в Литве «литфашики» пришли к власти, и теперь оттуда ни одного Абрама к батьке под крылышко не выманить...*

19 апреля, 05:21, Жандарм *Как сказал один весьма неглупый юморист, «каждый народ имеет то правительство, которое его имеет». Лукашенко в 94 году получил 86 (!) процентов голосов на вполне свободных выборах. Когда в 96 году он провел фактический госпереворот, никто и не пикнул, кроме горстки оппозиционеров. Так что поделом – кого хотели белорусы, того и получили. Беда только в том, что чем дольше правит это мурло колхозное, тем сильнее недовольство им, тем популярнее (особенно у молодых) идеи ублюдочной националистической оппозиции, тем сильнее опорочена в глазах многих белорусов идея сотрудничества с Россией. Когда Лука уйдет (точнее, его уйдут), республика может пойти вразнос похлеще Латвии с Эстонией (в смысле межнациональных проблем, фашизации и проч.). А это страшно. Вот о чем надо писать, а не повторять сомнительные байки о том, кто больной, а кто здоровый.*

19 апреля, 09:45, *Set*

Лука это просто красавец в своем роде! Он всех имеет, и плевать он хотел на мнение окружающих его стран. Он же в бедной Белоруссии ничего не имеет, за исключением хатки на краю географии... только данные ему по праву президента кортеж и резиденция. А работает на него вся страна! Ни одно дело в Белоруссии не проходит без его участия. И только пара-тройка счетов в Швейцарии... Так что ср.ть он хотел и на общественное мнение, и на народ, и на оппозицию! Ему продержаться за счет бабушек и дедушек, которые ему отдают свои голоса за его «бессребретность» и «заботу о пенсионерах» как можно больше, да побольше денег натягать! А говорить бред – это его «хобби»! :-)

19 апреля, 10:39, *YVD* *Все познается в сравнении. Не будь Лукашенко, мы бы думали, что Украина живет плохо.*

19 апреля, 10:50, Винни *Конечно, все эти вожди в недоразвитых странах сползают в манию величия. Вон Назарбаев учредил орден имени себя, любимого. Но вдвойне хуже, когда на это накладывается принцип «из грязи в князи». У Лукашенко просто крыша поехала: недавно еще в сортир на улице ходил, а сейчас вершитель судеб.*

P. S. от автора: Кажется, мы даже в глазах россиян превращаемся не в Гондурас, а европейское Буркина-Фасо, а наш президент воспринимается как экзотический африканский вождь в набедренной повязке и с копьем в руке. Дожили.

ИСТОРИЯ БОЛЕЗНИ

Конец вечного президента

Окончание. Начало на стр. 1

Только от вертикальной бюрократии зависит исход голосования против Лукашенко. Захотят ли вертикальщики от мала до велика нарисовать своему патрону дополнительные проценты голосов? Вдруг предпочтут кого-нибудь другого? Скажем, если не Семена Домаша на западном фронте, то Владимира Коваленка, оперирующего на восточном плацдарме.

Электоральные мечтания – штука привлекательная. Но пока у президента Лукашенко достаточно сил и здоровья, чтобы обеспечить должное почтение к своему чину и званию. Он еще может снять с должности и даже посадить любого своего вертикальщика. Совершенно иные расклады мы будем иметь во время его новой легислатуры.

К западным демократиям, давно уже неприемлющим Александра Лукашенко в должности главы белорусского государства, добавится российская бюрократия. В течение 3–4 лет предстоит переход РБ на рубль РФ. Но трудно поверить, что Лукашенко отдаст свои эмиссионные прерогативы российскому Центробанку. Другим фактором белорусско-российской напряженности обязательно станет вопрос приватизации огосударствленной белорусской экономики.

В 2002 году как на Западе, так и на Востоке постепенно начнут размышлять, как бы заменить Александра Лукашенко на более лояльную фигуру. Резкая дестабилизация белорусского политического режима неприемлема для обеих сторон. Смена белорусского политического курса должна осуществиться без серьезного изменения места и роли нашей страны в контексте мировой политике.

После так называемых президентских выборов Запад окончательно перестанет питать иллюзии насчет объединенной белорусской оппозиции. Но ни Россия, ни Европа с Америкой не собираются взращивать здесь новую оппозицию. Вполне резонно наши внешние контрагенты взаимно опасаются прихода к власти радикалов покруче президента Лукашенко.

Вот здесь-то на белорусскую оппозиционную сцену выступит вся президентская рать, пока еще послушная самым легким мановениям лукашенковской руки. Во время своего нового президентского срока Александр Лукашенко окажется в полной зависимости от собственного чиновничества. Едва ли бюрократия удовлетворится нынешним приниженным положением. Вскоре президентские слуги сами захотят стать хозяевами.

По всей видимости, все начнется с легкой фронды палатных депутатов. Затем наступит время закулисных переговоров членов правительства и функционеров президентской администрации. Из столицы до самой распоследней районной администрации поползет слушок о скорой смене власти предержащей. В нерешительности замрут чиновники силовых ведомств. Никто ничего не будет предпринимать из опасения неугодить новому, еще никому неизвестному хозяину страны.

Фрондирующей номенклатуре остается найти в своей среде компромиссную фигуру, устраивающую бюрократов всех мастей. Пусть это будет даже самый серенький представитель вертикального чиновничества. В советские времена таким компромиссом стала личность Леонида Брежнева.

Заговор белорусских чиновников может созревать сколь угодно долго, набирая критическую массу бюрократического недовольства. За это время оппозиционная демократия вполне может изобрести какой-либо хитроумный способ отрешения от должности президента Лукашенко. Тогда найдется и кандидат на должность исполняющего президентские обязанности.

Выбор методов избавления от неугодного начальства у наших заговорщиков не слишком велик. Структуры типа политбюро и ЦК КПСС, в свое время заменившие Брежнева на Хрущева, у них в белорусском государстве отсутствуют. Запустить процедуру импичмента через Нацсобрание и Конституционный суд тоже не представляется возможным.

Остается уволить Александра Лукашенко по состоянию здоровья. Повод заявить о его *«стойкой невозможности»* исполнять президентские обязанности уже имеется. Это психиатрический диагноз доктора Щигельского. *«Мозаичная психопатия»* вполне может стать разумным обоснованием государственного переворота.

Дело за малым: сменить президентскую охрану, а самого главу белорусского государства поместить в отдельную палату сверхзащищенного стражного отделения психлечебницы Новинки. Психиатрический диагноз с радостью утвердят обе палаты Нацсобрания. Вне властных структур тоже никто не будет защищать бывшего президента, официально объявленного психопатом.

Новые президентские выборы белорусская номенклатура назначит точно в конституционный срок. Опасаться ей нечего, поскольку механизм назначения президента через всеобщие выборы давно обкатан. Ставленнику номенклатуры победа гарантирована. А его шансы на белорусское президентство столь же реальны, как и у Александра Лукашенко на псевдовыборах, ожидающихся этой осенью. ■

БАНКАВАЯ СЫСТЭМА

Ад перамены месцаў сума не мяняецца

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Зь якой бы хуткасьцю ня падаў узровень жыцьця беларускіх насельнікаў, свае штомесячныя справаздачы Пётр Пракаповіч робіць усё больш бадзёрым голасам.

Ведаючы магутную пераканаўчую моц лічбаў, галоўны банкір краіны апісвае становішча банкаўскае сфэры мовай статыстыкі. І паўсюль у яго назіраецца хаця б невялікі рост паказальнікаў. Паведамленьне аб стане спраў у банкаўскай сфэры пасьля першага кварталу бягучага году выключэньнем ня стала.

Асноўным гонарам Пракаповіча ёсьць утрыманьне на патрэбным узроўні курсу разьліковых білетаў сваёй установы. Пры канцы азначанага пэрыяду амэрыканскі даляр можна было купіць (тэарытычна) за 1295 зайчыкаў. Прагноз быў на 23 пункты горшы. Стабільнасьць *BYB* каштавла Нацбанку адмоўнага сальда валютных апэрацыяў у памеры 3,3 мільёны *USD*.

Нацбанк пагадзіўся на такія страты, не дачакаўшыся абяцанага Расіяй стабілізацыйнага крэдыту. Па словах Пракаповіча, без расійскай дапамогі ён здольны падтрымліваць стабільнасьць *BYB* і надалей. Але крэдытныя сродкі лішнімі не былі б. Асноўным тормазам у справе пераводу расійскіх грошай на рахункі Нацбанку было нератыфікаванае беларускім бокам пагадненьне аб саюзнай грашовай адзінцы. Палата прадстаўнікоў дакумент ратыфікавала, але першы транш Беларусь атрымае няхутка. Бюракратычная цяганіна з ратыфікацыяй гэтага пагадненьня ў Радзе рэспублікі, падпісаньнем дакумэнта прэзыдэнтам і абменам копіямі паперак паміж МЗСамі абедзьвюх краін прымусяць беларускі бок сасаць лапу на працягу ня менш як месяца.

На пытаньне, куды будуць накіраваныя грошы, калі яны ўрэшце пастуцяць у распараджэньне Нацбанку, старшыня адказваць не пажадаў. Найхутчэй ён ведае, хто ў краіне найбольш пакутуе праз недастатковасьць фінансавых сродкаў, але ўголас аб гэтым сказаць саромеецца.

Прыемна Пракаповічу было хваліцца сваімі посьпехамі ў нарошчваньні, насуперак чаканьням, рэзэрваў. Чыстыя замежныя актывы ворганаў крэдытна-грашовага рэгуляваньня выраслі з 150,6 мільёна *USD* да 182,3 мільёна *USD*. Гэта сталася сюрпрызам для саміх нацбанкаўцаў. Яны меркавалі, што давядзецца (зноў-такі для падтрымкі курсу *BYB*) пайсьці на інтэрвэнцыі ў межах 60 млн. *USD* толькі ў першыя тры месяцы 2001 году. *«Але, на шчасьце, нашыя прагнозы пісьмістычныя ня спраўдзіліся,»* – паведаміў Пракаповіч. Стратэгічнай задачай сваёй установы ён назваў давядзеньне нацбанкаўскіх рэзэрваў да 100 адсоткаў чыстае рублёвае масы. У гэтым кірунку за азначаны пэрыяд таксама адбыліся станоўчыя зрухі. Напачатку году чыстыя замежныя актывы ў рублёвай грашовай масе складалі 55,9 адсоткаў. Да 1 красавіка іх доля паменшылася ўсяго на 0,1 адсотка. Падстава для гонару бясспрэчная.

Вельмі ўсьцешыла старшыню Нацбанку і сытуацыя з экспартам беларускае прадукцыі. Калі перавесьці ўсе валютныя паступленьні на рахункі прадпрыемстваў у даляравы эквівалент, дык агулам Беларусь пасьпела прадаць тавараў на 732,5 мільёны *USD*. Адначасова нашая краіна працягвае актыўна траціць валютныя рэсурсы. Станоўчае сальда гандлёвага балянсу складае па выніках кварталу ўсяго 62 мільёны *USD*. Хаця і гэты паказальнік для беларускай эканомікі дасягненьне.

Старшыня Нацбанку разумее, што экспартныя посьпехі абумоўленыя перадусім руплівасьцю прадпрыемстваў. Ён упэўнены, што ягоная грашова-крэдытная



палітыка таксама мае спрычыненасьць да гэтых паказальнікаў. Незразумелым застаецца толькі характар уплыву на эканоміку пракаповічавай актыўнасьці. Галоўны банкір спаласнуў рукі, катэгарычна адмовіўшыся ўзяць на сябе віну за неўтаймаваную інфляцыю. Пасьля такіх заяў абяцанка да сярэдзіны году ўсё ж вывесьці інфляцыю на прагназуемы ўзровень выклікае ў эканамістаў справядлівы недавер.

Агульны курс, якога трымаецца сёньня Нацбанк, расьпісаны ў праграме сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця да 2005-га году. Менавіта ў адпаведнасьці з гэтым дакумэнтам урад у гэтым годзе вылучыў 32,7 мільярда *BYB* крэдытаў. Амаль усе яны былі накіраваныя на мэтавае крэдытаваньне жыльлёвага будаўніцтва. За астатнія крэдыты давялося аддувацца банкаўскай сыстэме, ад якой запатрабавалі перавыкананьня прагнозных плянаў.

Ільвіную долю грошай (больш паловы) атрымала гэтым разам ня сельская гаспадарка, а прамысловасьць. Аграсэктару вылучылі пакуль трошку больш, чым на гандаль і грамадзкае харчаваньне – блізу дзесяціны ад агульнае сумы.

Адзінае, за што Нацбанк сапраўды можна пахваліць, гэта штодзённае зьніжэньне сярэдняе стаўкі па аднадзённых міжбанкавых крэдытах. Стаўка рэфінансаваньня ў сакавіку складала 2,2 адсоткі. Гэта вышэй, чым у нашых суседзяў з Украіны і Расіі, бо айчынны Нацбанк намагаецца прыцягнуць як мага болей укладаў насельніцтва і са скуры лезе, каб ягоныя дзеяньні былі падобныя да палітыкі дарагіх грошай.

Доля пратэрмінаваных крэдытаў узрасла апошнім часам да 16,4 адсоткаў. Велічыня, значная нават для беларускае эканомікі. Пётр Пракаповіч абвясьціў аб сваім імкненьні паменшыць гэты паказальнік да 10-х адсоткаў, аднак зрабіць гэта вельмі цяжка. Амаль усе невернутыя крэдыты выдаваліся калісьці прадпрыемствам рэальнага сэктару.

Калі чытаць статыстыку ў рублёвым адлюстраваньні, дык агулам памер устаўных фондаў камэрцыйных банкаў вырас на 5,9 адсоткі. У рэальным жа выражэньні ён паменшыўся на 6,4 адсоткі. Гэта стала адной з тэм абмеркаваных на апошнім паседжаньні кіраваньня Нацбанку. Вырашылі ўстаўныя фонды банкаў павялічыць. Паменшыліся таксама і валютныя дэпазыты. На 2 зь лішкам мільёны даляраў пры тым, што ў першым квартале больш выгадна было захоўваць грошы ў *USD*.

З пачатку красавіка МВФ даўтакі старт сваёй маніторынгавай праграме. Па словах Пракаповіча, Майклу Хортану, прадстаўніку місыі МВФ ў рэгіёне, не патрэбна нічога звыш выкананьня ўзгодненых прагнозных паказальнікаў. Гэта значыць, што для таго, каб экспэрты з МВФ засталіся задаволенымі, трэба, каб рэальны стан эканомікі адпавядаў праграме сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця краіны. Прагнозы, як паказвае досьвед мінулых гадоў, падпісваюцца толькі для таго, каб быць складзенымі на паліцы, а пры канцы году прадстаўленымі грамадзтву як занадта аптымістычныя. ■

ПАЛІТЫЧНЫ ПАРТРЭТ

ШКЛОЎСКІЯ СТРАСЦІ

ВОЛЬГА ПАЎЛАВА

Працяг. Пачатак у №№ 7–16

СІРЭНА

Кожны раз, калі я бралася выкладаць на паперу свае ўспаміны, па-новаму радавалася, што, нарэшце, адважылася гэта зрабіць. Ажно на сэрцы лягчэй стала. І шчаслівай сябе пачуваю, што адхрысцілася ад Лукашэнкі яшчэ да ягонага трыумфу. Мне, праўда, усё роўна баліць: радзіма ж любая мая пакутуе... Не сорамна толькі. Бо я не мацавала гэты рэжым.

Прызнаюся, шчыра спачуваю электарату Лукашэнкі, тым, каму за ... Якое ж цяжкае для іх пахмелле наступае! І міжволі чуючы паўсюдны лямант наконт невыноснасці жыцця і яшчэ больш змрочных перспектываў, наважваюся на высновы: жыццё, сапраўды, мудрае, і сваю ісціну давядзе, калі не праз галаву, дык праз іншую частку цела, страўнік напрыклад. Таму мяне не пакідае надзея: можа, калі-небудзь пасвядомее мой братка-беларус...

Я часта думаю (без гэтага ў наш час аніяк!): чаму Лукашэнку так безаглядна вераць? Чым ён так заварожвае людзей, што яны, не зважаючы на відавочнае, жывуць яго словамі? І прыйшла да высновы: дык ён жа **сірэна!** Гэта няхай у якой-небудзь грэчаскай міфалогіі сірэна – марская істота ў выглядзе птушкі з жаночай галавой, якая словамі зацягвае маракоў у пагібельныя месцы. А ў нас усё па-іншаму, па-беларуску, значыць, сірэна-прэзідэнт спевамі сваімі зацягвае беларускі народ у багну жабрацтва, нядолі, рабства.

Лёгенька рагатаць з нас таму забугорнаму свету: ён жа пазбаўлены магчымасці чуць гэтую сірэну зблізку. Вось і жыве там нармальным чалавечым жыццём. А наш Аляксандр Рыгоравіч сваімі незмаўкаючымі песнямі-прамовамі дэзінфармуе насельніцтва і пудрыць ягоныя мазгі. Ад такога стану галаўной каробачкі да пагібелі – адзін крок, два – і аблічыўся.

Да нашага фінішу справа яшчэ не дайшла. Давайце лепей паразважаем над лёсам тых, чые імёны на слыху. Пра Васіля Севасцьянавіча Лявонава, напрыклад.

Лёс, шчодры на запамінальныя сустрэчы, звёў мяне з ім у той час, калі ён узначальваў Горацкі РК КГГВ. Я тады была радавым журналістам і з начальствам такога рангу спраў не мела. Але як любілі і паважалі яго людзі, як запаланялі яго прыёмную ў дзень прыёму – панядзелак! І не толькі з просьбамі ды скаргамі хадзілі, а і з падзякамі. За справы папярэднія. І цяпер на горацкай зямлі ўспамінаюць гэтага чалавека добрымі словамі.

Калі Васіль Севасцьянавіч Лявонаў раптам пачаў рэзка ўздымацца па службовай лесвіцы, людзі, шкадуючы з ім развітвацца, разумелі, што для добрага чалавека і добрых ягоных спраў патрэбны іншы, глабальны размах – так можна большай колькасці людзей дапамагчы. І вялікай неспадзяванкай тое, што Лявонаў накіраваны на працу за мяжу, таксама не было. Што ж, і ў далёкай Нямеччыне няхай ведаюць нашых! Сапраўдных разумнікаў маем.

А вось што Васіль Севасцьянавіч перайшоў на службу рэжыму... Асабіста для мяне гэтая навіна грымнула, бы тая навальніца ў калядны мароз. Назначэнне на расстрэльную пасаду, як неафіцыйна называюць высокія, ключавыя пасты ў вышэйшых эшалонах улады, расцаніла як спакусу запіхнуць у кішэню яшчэ больш грошай, чым убачыў іх за мяжой. Хоць і багнавая ў нас гэтая сельскагаспадарчая галіна, але ж украсці можна.

Толькі вось у чым пытанне: наколькі сапраўды заплямiў сумленне Васіль Севасцьянавіч? І ці заплямiў увогуле? Надта падазронай праз прызму часу здаецца валакіта са справай Лявонава. А што да суда давесці, дык можна практычна любога. І Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка гэта сам ведае. Бо неаднойчы паўтараў яшчэ ў пару свайго дырэктарства: «*Кіраўніка любога рангу праз пяць гадоў можна судзіць смела*». Ён меў на ўвазе недасканаласці прававой і фінансавай сістэмы Беларусі, якія самі падштурхваюць да парушэнняў у час вырашэння вытворчых пытанняў.

А што да Васіля Севасцьянавіча, дык я добра памятаю той час, калі Аляксандр Рыгоравіч пахваляўся яго прыхільнасцю да сябе, мог проста набраць нумар абласнога лідэра, якім на той час быў Лявонаў, патусавацца ў яго кампаніі, каб пабачыў люд, які ў Аляксандра Рыгоравіча магутны апякун. А падчас яго вярхоўнасаветаўскай, а потым і прэзідэнцкай гонкі праз АБГ (адна баба гаварыла) многім было вядома, што шклоўскаму бегуну на чэмпіёнскія дыстанцыі такую перамогу дапамог узяць у прамым і ўскосным сэнсе і Васіль Севасцьянавіч Лявонаў. А можа... Можа, яны разам рабілі якую-небудзь «справу», з-за якой адзін трапіў за краты, а другі без суда і следства гноіць яго, баючыся, што колішні партнёр скажа лішняе?

* * *

«На Кругляншчыну едзе прэзідэнт!» – разносіў па наваколлю навіну лістапад 1998 года. Рыхталіся да вашага, Аляксандр Рыгоравіч, прыезду яшчэ з лета. Усё будавалася, фарбавалася, драілася. Не была раўнадушнай і я. Усё вагалася, ці паглядзець, якім вас зрабіла неабмежаваная ўлада, ці лепш дома адсядзецца, бо раптам вы зноў зачаруеце мяне сваімі песнямі, і тады я кіну на сметнік гэтыя мемуары...

Але, паверыўшы ў свае сілы і непахіснасць, вырашыла ісці на плошчу і паслухаць «песні». Я пайшла крыху раней, каб з нагоды таго прыезду хоць цукру кілаграмчык купіць. Але замест яго «выкінулі» соль, цукеркі, цыгарэты. Стала ў чаргу да павільёна. Было холадна. Праўда, магла б і ў магазіне пастаяць, але ж адтуль не было бачна месца вашага прызямлення. Шкада, што ў той час вы не стаялі побач. Але, пэўна, здзівіліся б, калі б пачулі словы ўдзячнасці ў свой адрас. За тое, што з нагоды вашага прылёту выкінулі ў продаж цукеркі немудрагелістага вырабу, якімі, нарэшце, можна будзе пазабавіць дзятву. У чарзе стаялі адны жанкі. А мужчыны знаходзіліся паводдаль і не зводзілі вачэй ці то з вашага верталёта, ці то з віхуры, якую ён падняў пры пасадцы і ўздыбіў спадніцы прысутных жанчын, што спецыяльна прыбраліся да вашага прыезду.

Напярэдадні вашага прылёту ў Круглае столькі служывых у цывільным панаехала, што яны і самі, пэўна, адчулі сваю недарэчнасць у маленькім пасёлку і таму, як маглі, «касілі» пад абарыгенаў.

Але, мушу прызнацца, зорачкі свае яны адпрацоўваюць спраўна: не было ў Круглым вачэй, у якія яны б не зазірнулі; не знайшлося пад адзеннем людзей адтапыркаў, якія б яны не паразглядзелі (а раптам – зброя?!).

Красамоўным сведчаннем звышувагі стаў інцыдэнт з Шалвам Ераставічам Сахадзе. Вы не ведаеце яго, таму я крышачку праінфармую. Гэты сівы аксакал пасяліўся на Кругляншчыне ў гады вайны – спачатку ў лясах, дзе партызаніў, а пасля – у райцэнтры. Завёў сям'ю, увогуле ўнёс сваю грузінскую адметнасць у мясцовы каларыт.

Я тут чалавек новы, але даволі хутка пераканалася ў значнасці Сахадзе. І, пэўна, калі б лёс не закінуў сюды гэтага чалавека, Кругляншчыне яго б неставала. Ён і сам, па ўсім відаць, гэта адчувае, таму і ўдзельнічае ва ўсіх святах, урачыстасцях раённага маштабу, не забываючы засведчыць сваю павагу школам, дзіцячым садкам, працоўным калектывам. І вам, напэўна, хацеў засведчыць сваю павагу. Таму і накірунак узяў у ваш бок. Але ўжо аднаго гэтага было дастакова, каб людзі з вашае аховы накінуліся на яго і з абодвух бакоў, бы пад канвоем, пацягнулі прэч з вачэй вашай міласці. Старэчы тэмп быў значна ніжэйшы. Таму Шалва Ераставіч спачатку хутка-хутка прасеменіў, а потым збіўся з тэмпу і павіс на дужых руках ахоўнікаў. Толькі там, на домсаветаўскіх задворках, пакінулі дзядулю ў спакоі пад наглядам міліцыянера. Доўга-доўга яшчэ ветэран Вялікай айчыннай стаяў і глядзеў адтуль на сустрэчу, якая, мабыць, упершыню на круглянскай зямлі праходзіла без яго жывога ўдзелу. І слёзы насоўкай сціраў з вачэй.

Але нічога гэтага вы не заўважылі. Бо цэлых паўтары гадзіны прастаялі да круглянцаў, якія прыйшлі вас вітаць, месцам, дзе ніколі не бывае вачэй. Роўна паўтары гадзіны доўжыўся ваш дыялог са старшынёй райвыканкама Аляксандрам Андрэевічам Папковым. Магчыма, менавіта столькі часу спатрэбілася вам, каб пераканаць яго перайсці на працу ва ўрад. Што, зрэшты, ён і зрабіў ледзь не адразу пасля вашага адлёту. Ну, гэта ўжо ягоная справа. Толькі ж навошта вось так, задам да народа? Ці, на вашу думку, гэтага і заслугоўвае электарат, здольны толькі нястомна працаваць ды бяздумна галасаваць?

РУКИ ПРОЧЬ ОТ НАШИХ ДЕТЕЙ!

...Я не хацела даслухоўваць прамову прэзідэнта. Нічога новага ён не казаў. Не адчувалася нават эмацыянальнага напалу ў голасе. Відаць, не сілкаваў яго энергію маштаб электарату. І я пайшла дамоў. Да самага дома яшчэ біла мне ў спіну хваля яго голасу з дынамікаў, развешаных па перыметру плошчы. А ледзь адчыніла дзверы ў кватэру, пачула гучны голас дыктара з радыёпрыёмніка, які, відаць, з нагоды прылёту прэзідэнта прарэзаўся. З інфармацыі вынікала, што прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка ў мэтах кантролю наведаў Круглянскі раён і ў даны момант знаходзіцца ў Дрыбіне, дзе знаёміцца з сацкультбытам жыхароў. І далей – з кім гутарыць, каго заслухоўвае, якія праблемы вырашае і ўздымае.

У недаўменні я адключыла прыёмнік, адкрыла, нягледзячы на холад, фортку і высунулася на вуліцу. На той момант рэха дынамікаў з плошчы даносіла развітальныя акорды прэзідэнцкай прамовы. Ён яшчэ знаходзіўся ў Круглым. Падумалася: такая вось проза нашага жыцця, такая палітыка прэзідэнта: «*не вер вачам сваім, а вер словам маім*». Ці далёка яна завядзе нас? І куды? ■

ЛІСТ У НУМАР

ВЕРТЫКАЛЬ ЗДАСЦЬ ЛУКАШЭНКУ

На весцы разам з птушкамі множыцца новы настрой электарату:

– За каго галасаваць?

– За Лукашэнку?

– Дык жа кажуць, што яго не выберуць! Не, трэба некага другога, бо сказалі, Лукашэнку больш не выберуць...

Гэтая аргументацыя стала вынікам замяталінскай прапаганды праз азвяронкаў з БТ і дзяржаўнага друку. Людзі ў нас прагматычныя: пачулі, што «*будуць бамбіць, як Югаславію, калі Лукашэнка не сыдзе*», – і ўмомант адхіснуліся душою да пераможцы.

Я не раз пытаўся ў актывістаў сённяшняга рэжыму, калі заходзіла гаворка пра ўсенароднае рушэнне на абарону рэзідэнцыі на Карла Маркса, 38: «*Ты пойдзеш з аўтаматам абараняць Лукашэнку, як некалі саратнікі абаранялі Альендэ?*» І з дзесяткаў адданых толькі адзін адказаў, што пойдзе, толькі ў яго няма аўтамата. Апытайце знаёмых, і вы атрымаеце тую ж сітуацыю, што была пасля развалу КПСС: ніхто не выйшаў бараніць ЦК.

Магу назваць лічбы рэальнай падтрымкі «*всенародноизбранного*»: не больш за 17 працэнтаў нават у лепшыя дні, калі зыходзіць з ацэнак яго палітыкі. Між тым, як за БНФ заўсёды, бескампрамісна галасуе мільён (!) праціўнікаў Лукашэнкі.

Зазначым, што за лукашэнкаўскім часам на чвэрць (!) узрасла колькасць абаронцаў дзяржаўнасці беларускай мовы. Менавіта акупацыйны статус замяталінскай ідэалогіі проціставіў памяркоўных намеру забараніць беларускую мову. Вар'яцкую фразу «*запретить белорусский язык*» падтрымалі ўсяго 0,03 працэнта апытаных, у асноўным пенсіянеры з партапаратчыкаў.

Лічу магчымым і далей «рассакрэчваць» інфармацыю з дасье сацыёлагаў. Сёння рэйтынг Лукашэнкі сярод студэнтаў – 2,5 працэнты. У ліцэістаў, гімназістаў – наогул у межах статыстычнай памылкі. Нават рэктараты не могуць падвысіць лічбы падтрымкі Лукашэнкі больш за 10–13 працэнтаў. Да гэтага ўзроўню яны зніжаюць рэйтынг Чыгіра і Домаша.

Электаратнае ядро Лукашэнкі вымерла за гады яго панавання: вечная памяць ветэранам Вялікай айчыннай. Сёння нават сярэдняй рукі палітолаг не возьмецца фальсіфікаваць расклад інтарэсаў у народзе. Бо нават рускаэтнічны афіцэрскі корпус не хоча ажыццяўлення замяталінска-посахоўскіх ідэалаў. Ніхто не памяняе «Мерседес» на «Волгу», а «Фольксваген» на «Масквіч». Ніхто не будзе мець справу з расійскай фірмай, калі ёсць германскі ці аўстрыйскі партнёр. Менавіта сумесныя з расійцамі фірмы (філіялы) зацікаўлены ў заходнім вектары.

Нават аналітыкі з ліку расійскіх камунапатрыётаў разумеюць, што Беларусь лепш мець як Ганконг, чым Калужскую губернію. Расійская прадукцыя неканкурэнтаздольная на сусветным рынку. І ў Нарыльску вырошчваюць ананасы, але ж не канкурэнт яны папуаскім! А адлегласць да Цюмені ў колькі разоў даўжэйшая, чым з Гродна да Балтыкі. Увесь народ са скуры вылазіць, каб заплаціць Газпрому і РАО ЕЭС. Дык што ж за бацька ў хаце? У вайну такога не было!

Пры Кебічы было 8(!) міліцэйскіх шчытоў для «аховы» Дома ўрада. Ні разу не разганялі натоўп нават пад вокнамі прэм'ер-міністра. А сёння прафесура – генералітэт інтэлігенцыі Беларусі, выдатнікі-студэнты сталі аб'ектамі рэпрэсій статысячнай жандармерыі. Троечнікі помсцяць выдатнікам.

Вопыт рэвалюцый сведчыць, што піраміда апазіцыі расшыраецца ўніз, застаючыся эзатэрычнай. А ў нас? А ў нас адсякаюцца ўсе спадарожнікі, усе аўтарытэты ў асяродку «балота» шальмуюцца.

А дзе набор аргументацыі, «цытатнік» апазіцыі? На выбары ж сабраліся. Акрамя навуковых дакладаў патрэбны тэзісы кандыдатаў, на ўсе лады паўтораныя, каб завучваліся народам. Дзе «заказ» таленавіцейшым майстрам дыялектыкі спрэчак?

Дзе рэжысура і драматургія масавага дзейства? А столькі ж кадраў, непрымірымых да рэжыму! Столькі геніяльных анекдатыстаў! Дзе сістэма агітацыі, скаардынаванасць аргументаў, звестак, роздуму, пагалосак?

Народ сам, ратуючыся, рэдагуе апазіцыйны сцэнарый. Спецыялісты не могуць не заўважыць тэзісаў народнага дыялогу з уладай. Гэтак жа, як і спісу дзейных асобаў у фальклорнай масоўцы, што іграе супраць Лукашэнкі.

Руска-этнічная супольнасць на Беларусі згодна на нацыянальна-вызваленчы характар будучага ладу. Яна за заходні вектар. За таможню і закрытую мяжу з Расіяй. Бо ўсім патрэбен кардон ад злачыннага свету з Азіі і выгады ад памежных нацэнак для гандлю. Але пры адной умове – нацыянальна-культурная аўтаномія. Дарэчы, балбатня пра «*разрезанные по живому вековые связи*» – гэта на публіку, як і свабодны праезд да сваякоў на Сахалін.

Вертыкаль адназначна супраць Лукашэнкі, асабліва старшыні калгасаў і сельсаветаў. Яны чакалі зямлі і маёмасці, а дачакаліся разбурэння. Быць уласнікам вялізных комплексаў ці падпарадкоўвацца сотням правяральшчыкаў-хапуноў – розніца ёсць? Гэта адказ на занядбанне сельскай гаспадаркі самымі чырвонымі памешчыкамі.

Уся вертыкаль здасць Лукашэнку аднадушна і ў адзін-два дні. Адразу ж, калі, напрыклад, генерал КДБ Мацкевіч аб'явіць пра свой удзел у штабе аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты: ага, значыцца Крэмль ставіць на Мацкевіча (ці праз Мацкевіча) супраць Лукашэнкі. Усё, яму капут.

Выбар паміж крамлеўскім і амераканскім кандыдатам – ужо ідзе. І найбольшая заслуга ў гэтым – не апазіцыі! Нават «Народная воля», якая ўжо заслужыла месца ў падручніках гісторыі, так не ўдзяўбла б у галовы бюракратаў, чырвоных памешчыкаў і шэрых капіталістаў альтэрнатыву, як замяталінскія СМІ, азвяронкі з ТБ і жданаўскія газетчыкі.

Я паводле абавязкаў і з асалодаю чытаю так званую «*коммуно-патриотическую прессу*». Нагадаю, як «Рэзананс» аднойчы ўзрушана абвясціў выснову расійскага генштабіста: «*Беларусь, калі не адмовіцца ад Лукашэнкі, будзе мець, як Югаславія*». Ці пасаж з газеты «Завтра»: «*Пауэлл потребовал полного вывода российских войск с чужих территорий (имеются в виду страны СНГ), а также прекращения поддержки Лукашенко и идеи российско-белорусского союза плюс отказа от восстановления союзных отношений с другими постсоветскими государствами, прежде всего Украиной и Молдовой*».

Досыць гэтага, каб вертыкаль змікіціла: ага, ЗША ўсё ж не дапусціць Шурыка, а Крэмль здасць яго, як Мілошавіча. Ці мог пленум ці з'езд КПБ галасаваць, скажам, за Аксёнава, калі Палітбюро прызначыла Слюнькова ў беларускія машэравы? Кожны бюракрат скажа: вядома ж, не! Усе камуністы Беларусі добра ведаюць, што сёння Палітбюро не ў Крамлі, а ў Вашынгтоне. Вось і ўся палітыка!..

Ўратавацца Лукашэнка мае шанец толькі змяніўшы платформу. Звальняе за распальванне канфрантацыі Замяталіна, прызначае «беларускамоўнага» прэм'ера, той склікае ВС-13. Лукашэнка перадае на час выбараў паўнамоцтвы прэм'еру. Есць і іншыя манеўры.

Напрасткі, у лабавую Крэмль не мае шанцаў правесці свайго кандыдата. Іншая справа, Мацкевіч у штабе Домаша ці Чыгіра, ці свой «Каштуніца«. Калі Лукашэнка не зменіць платформу, то апазіцыя можа лёгка прыйсці да перамогі ў першым туры, арганізаваўшы адзін штаб па зборы подпісаў – адзін зборшчык трымае спісы і за Домаша, і за Чыгіра і за «Каштуніцу«. Пасля збору подпісаў стане відавочным рэйтынг кожнага. Аб'яўляецца адзіны кандыдат, астатнія ўваходзяць у каманду.

Лукашэнку падтрымае не больш 10–17 працэнтаў у любым туры. Ужо гаварылася, што за тыдзень да галасавання прэзідэнт будзе прызнаны вертыкаллю, калі яго адназначна, хай сабе груба, назаве Буш, Германія і (або) Крэмль. Ніякіх пераваротаў не будзе: Навумаву проста не дадуць зрабіць непапраўнае злачынства.

Так што, усё ў нас будзённа і без істэрыкі. Істэрыку стварае замяталінскі штаб, мімаволі пераносячы у эфір жудасць са сваёй душы. А новыя людзі сёння да Лукашэнкі не пойдуць.

УЛАДЗІМІР ІСКРЫК, МІНСК

СПОРТОБЗОР

Англо-испанские войны

Отгремели четвертьфиналы в элитной лиге старого света. Миллиарды людей во всем мире стали свидетелями нового англо-испанского триумфа. Лишь «Бавария» смогла вклиниться в противостояние между Туманным Альбионом и клубами с Пиренейского полуострова. Но обо всем по порядку.

Первыми выяснять, кто же сильнее, вышли на поле в Лондоне «Арсенал» и «Валенсия». Все прекрасно помнят, что стартовый навал «канониров» гости успешно выдержали и даже сами смогли отличиться. Айяла после неразберихи в штрафной в упор расстрелял Симэна. Но быстроногий Анри не дал валенсианцам возможности долго упиваться своим превосходством. А спустя пару минут гол-красавец сотворил Парлор, который с 25-ти метров вогнал мяч под перекладину. Таким образом, лондонцы ехали на ответный матч с минимальным голевым преимуществом и не сумели его сохранить.

«Летучие мыши» не очень много создали моментов у чужих ворот, да и форвард «Валенсии» Кэрью, при определенном стечении обстоятельств, вполне мог стать героем для всего Лондона. Трижды Джон промахивался из выгодных положений, и, может быть, Эктор Купер даже подумывал о замене, если бы темнокожий норвежец кивком своей лысой головы не заставил капитулировать голкипера «Арсенала». Анри и К° не смогли перестроить ход игры и ничего путного у ворот Канисареса не создали. В полуфинал вышли испанцы.

В те же дни отношения выясняла еще одна пара соперников. «Депортиво» пожаловал на стадион «Хайберри» в гости к амбициозному «Лидсу». И надо сказать, хозяева полностью извлекли данное им преимущество своего поля. Галисийцы были биты по всем статьям. В отсутствие ведущих игроков обороны испанцы пропустили три безответных мяча и с этим грузом отправились домой. В ожидании реванша болельщики полностью заполнили стадион «Риасор», но так и не увидели триумфа своей команды. Победа (2:0) вывела в следующий раунд представителей Туманного Альбиона. В полуфинале англичан ждет еще один испанский клуб, возглавляемый Эктором Купером, и он, скорее всего, не будет такой легкой добычей, как предыдущий.

Все помнят финал Лиги Чемпионов 99-го года, когда «Манчестер Юнайтед» уже в добавленное арбитром время сумел отыграть мяч, пропущенный от «Баварии», и забить еще один. Стоит ли говорить, что с тех пор манкунианцы – злейший враг мюнхенцев. И поражение дома после вымученной победы в Англии стало бы огромным разочарованием для поклонников немецкой команды. Реванш состоялся, зрители давно не видели «Баварию» такой собранной, организованной и целеустремленной. Элбер в начале и Шолль в конце первого тайма свели шансы соперника к нулю. И даже мяч, проведенный в ворота Кана в середине второго тайма, ничего не смог изменить.

Но им не удается такой прессинг, которым славится игра чемпиона Турции. Следующим соперником нынешнего обладателя звания лучшей команды Европы станет мюнхенская «Бавария». Для немцев этот матч также весьма принципиален: именно «Реал» выбил их в прошлом году из розыгрыша Лиги Чемпионов.

Еще одна англо-испанская пара боролась в кубке УЕФА. Традиционно не забив, но и не пропустив, «Ливерпуль» в гостях дожал «Барселону» (1:0), и англичане в финале, где им будет противостоять «Алавес». Создав огромный задел уже в первой встрече (5:1), испанцы уверенно прошли немецкий «Кайзерслаутерн».

Сильнейший пока не известен



20 апреля состоялись первые матчи четвертьфинала Кубка Беларуси по футболу. Наибольший интерес для болельщиков и специалистов представлял матч между прошлогодними золотым и серебряным призерами – «Славией» и «БАТЭ». Мозырский клуб, как известно, намерен повторить свой прошлогодний успех, нарушить который всерьез собирается «БАТЭ». Однако первые встречи не дали вразумительных ответов на дальнейшие кубковые перспективы всех четырех клубов. Наиболее серьезный задел создало перед ответными поединками минское «Динамо», переигравшее солигорский «Шахтер» (3:1).

Теперь горнякам придется выигрывать в Минске с разницей в три мяча, что весьма проблематично, но, безусловно, возможно. Несколько сложнее ситуация в других парах. Победа «БАТЭ» на поле «Славии» (2:0), конечно, дает определенное преимущество борисовчанам, но, по меркам белорусского первенства, их соперник – команда, которой все равно, где выигрывать. Аналогичная ситуация в паре «Ведрич-97» – «Торпедо-Кадино» (2:0).

Еще более все запутано в противостоянии «Белшины» и «Гомеля», встреча которых закончилась вничью (2:2). Ответ на вопрос о полуфиналистах станет известен лишь второго мая, когда состоятся ответные встречи.

Гонка на выживание

Первый раунд плей-офф Кубка Стэнли лишь подтвердил давно известную истину: это отдельное соревнование, имеющее мало общего с регулярным чемпионатом. И побеждает в нем не тот, кто формально сильнее, а тот, кто больше стремиться к победе и готов за нее побороться. Уже первые серии дали тому подтверждение. Из дальнейшей борьбы выбыла вторая команда по итогам сезона «Оттава», бесславно уступив «Торонто» 0:4, покинул розыгрыш его постоянный фаворит «Детройт», чьи «крылья» подрезали «короли» из Лос-Анджелеса (4:2). А ведь это только первый раунд, и основная борьба еще впереди.

ПОДГОТОВИЛ СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

ТЭАТР

Пад медзянымі збанамі са Стамбула

АНДРЭЙ АХМЕТШЫН

Новы спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (Малая сцэна) малюе цікавую карціну: русавалосая жанчына, якая не мае нічога ўсходняга ні ў знешнім выглядзе, ні ў рухах, натхнённа танцуе пад медзянымі турэцкімі збанамі і гарлачыкамі.



Гэтак пачынаецца спектакль «Саламея» па п'есе Сяргея Кавалёва, які паставіў акцёр і рэжысёр Купалаўскага тэатра Аляксандр Гарцуеў. Новая пастаноўка працягвае стратэгію тэатра на стварэнне гістарычных спектакляў. Гледачы могуць убачыць у Купалаўскім партрэт князя Вітаўта на фоне яго генеалагічнага дрэва. А вобраз Барбары Радзівілл пакідае ўражанне беларускай Джульеты, якая гіне ад варожасці паміж палітычнымі сіламі Літвы і Польшчы. Пра Саламею ж, прыдворную лекарку турэцкіх паноў, мы ўвогуле нічога не ведалі.

Цікавую гісторыю лёсу гэтай жанчыны, якая нарадзілася «*паміж Польшчай і Масковіяй*» і дасягнула грамадскага становішча ў Турцыі (яна нават мела магчымасць выкупляць з палону аўстрыйскіх афіцэраў) адкапаў драматург і вучоны-мовавед Сяргей Кавалёў. Па яго п'есе пра Саламею ўжо паставілі спектакль у Мінскім абласным драмтэатры (рэжысёр Рыд Таліпаў). Маладзечанцы зрабілі акцэнт на захапляльных старонках біяграфіі жанчыны. А купалаўцы паспрабавалі надаць фактам філасоўсі сэнс.

Сляпая турэцкая дзяўчына Айшэ (арт. Вольга Фадзеева) знаёміцца з прыдворнай лекаркай Саламеяй (арт. Зоя Белахвосцік). Айшэ кахае паэта Нідзіма (арт. Мікалай Прылуцкі), які ўзаемна кахае яе, але дзяўчына не хоча, каб яе любы стаў мужам сляпой. Саламея вырашае вылячыць Айшэ. Аднак не ад хваробы зроку, а ад кахання. Яна расказвае гісторыю аб тым, як яе кінуў першы муж, нямецкі лекар Якуб (арт. Мікалай Кірычэнка), як здрадзіў другі, аўстрыец Фартунат (арт. Ігар Дзянісаў), як падмануў трэці, малады Адоніс (арт. Андрэй Гладкі). Але ад «*сеансу псіхатэрапіі*» каханне Айшэ да паэта ніколькі не зменшылася. А Нідзім, даказваючы глыбіню свайго кахання, нават ахвяруе дзеля здароўя Айшэ ўсю сваю маёмасць. Здзіўленая ўзаемным пачуццём паміж маладымі, якое Саламея бачыць упершыню, лекарка дапамагае дзяўчыне атрымаць здароўе дарма.

Медзяныя збаны над галавой Саламеі выконваюць падвойную функцыю: з аднаго боку, сімвалізуюць халоднае стаўленне да жанчыны яе любімых мужчын, з другога – увасабляюць культуру краіны, якая стала для яе другой радзімай. Тры сукенкі Саламеі таксама нясуць вобразны сэнс. Яны ўвасабляюць тры перыяды жыцця, звязаныя з яе мужам. Адначасова – і гэта вельмі істотна – адлюстроўваюць змяненне душэўнага стану гераіні. Актрыса не пераапранае сукенкі, а здымае з сябе спачатку чорнае, потым чырвонае адзенне і застаецца ў белым. Саламея шукае ў жыцці асабістае шчасце, аднак шляхам пакут, страт, пазбаўленая страсцей прыходзіць да высновы, што сапраўднае шчасце – дапамагаць бліжняму.

П'еса напісана ў жанры апавядання. Саламея перагортвае старонкі сваёй біяграфіі, спыняючыся на самых істотных эпізодах. Рэжысёр выкарыстоўвае той жа метад: перад гледачом з'яўляюцца старонкі-сцэны з адбіўкай святлом і музыкай паміж карцінамі. Акцёры выходзяць на сцэну, прачытваюць пэўную главу біяграфіі Саламеі і выходзяць за кулісы. Часам такое цячэнне падзей нават нагадвае літаратурна-драматычную кампазіцыю.

Спектакль «Саламея» – самы стрыманы з усіх творчых работ Аляксандра Гарцуева. Хаця тут, як і ў папярэдніх яго пастаноўках, эфект дасягаецца не мастацтвам слова і рухаў, а сілай музыкі і голасу акцёраў, спектакль не пазбаўлены прыемнага камернага гучання, нагадваючы першы, высока ацэнены крытыкай, творчы вопыт рэжысёра ў Купалаўскім – спектакль «Крывавая Мэры». А гульню з сімваламі: пераапрананнем у галоўныя моманты дзеяння, святлом, якое ільецца са збаноў, – увогуле выкарыстоўвае ўпершыню. ■

МУЗЫКА

Панки ненавидят нацизм и рок-звезд

НИКОЛАЙ РЕЧИЦКИЙ

Легенда белорусского анархо-панк-хардкора группа *DEVIATION* нечасто радует своими приездами Минск. И последний ее приезд как всегда не обошелся без инцидентов. На сей раз скандально известная группа получила «рубильник в спину» от администрации минского «Рок-кафе» в «4 апельсинах».



Минский концерт в «4 апельсинах» был лишь частью грандиозного панк-штурма, пронесшегося по городам Беларуси в двадцатых числах апреля. В акции принимали участие лучшие белорусские панк-команды *451F*, *DEVIATION*, *CONTRA LA CONTRA* и немцы *MORBID RAGE*.

Именно с товарищами из «сытой бюргерской» Германии я и встретился накануне их отъезда в Гродно. Итак, *MORBID RAGE*: Майк (гитара,вокал), Деннис (гитара, вокал), Марти (бас), Эрик (ударные).

– Каково ваше мнение о концерте?

– Концерт был прекрасный, но менеджер клуба боялся политических текстов. И я думаю, что мы смогли сказать свой *fuck* системе и государственному контролю только потому, что мы немцы. Глупо, но это так.

– Расскажите о вашей музыке и идеях.

– Что касается музыкального стиля, мы не можем определить его. Это просто то, что мы хотим делать, и мы делаем это. Но наши тексты объясняют, чего именно мы хотим. Мы выступаем против государственного контроля, фашизма и прочих подобных вещей.

В Германии довольно много таких групп. Групп, которые просто делают то, что они хотят делать. И есть люди, которые хотят их слушать. Речь не конкретно о нашей музыке, речь об альтернативной сцене вообще.

– Вы дали серию концертов. Отличались ли концерты и публика в других городах от минской?

– Да, концерты в других городах сильно отличались. Я не знаю почему. Они довольно далеко от цивилизации... Шутка. В Бобруйске было много скин-хэдов, милитаристской публики. Они делали *«Хайль Гитлер»* перед сценой, наверное потому, что мы немецкая группа. Они вряд ли имели хоть какое-то представление о том, что значит сказать *«Хайль Гитлер»*. И это очень странно. Мы не можем понять этого, потому что наци убивали ваших людей. Они думали, что мы «наци-панки», потому что мы из Германии. Информация полностью неправильная. Вообще, отсутствие информации – это очень большая проблема. Но волна групп, таких как *CONTRA LA CONTRA*, *DEVIATION*, старается объяснить публике, что происходит, и дать информацию, а также делать это через фэн-зины, журналы и прочие каналы.

Но ваша публика лучше, чем в Германии, потому что она более радостно воспринимает такие концерты. В Германии человек приходит на концерт, спокойно смотрит и уходит домой... И есть другие группы, подражающие *GREENDAY* и подобным звездам. А мы не звезды, мы ненавидим понятие «рок-звезда». Мы не видим в этом ничего хорошего. Это ужасно.

– Что вы думаете о политических и социальных проблемах в разных странах? Они принципиально разные или одинаковые?

– Проблемы одинаковы, но в Беларуси они гораздо жестче. Государственный контроль – это дерьмо. В Германии это тоже проблема, но не настолько. У вас все похоже на Штази, ты в курсе?

Когда концерты останавливают из-за политической лирики – это полный маразм. В Германии мы можем петь все, что хотим. На концерте группе *DEVIATION*, выступавшей перед нами, просто отрубили электричество. Сначала мы даже не хотели выступать после этого. Но потом мы поняли, что люди перед сценой хотят слышать эту музыку, и мы сказали *DEVIATION*, что будем играть, но будем говорить со сцены те же вещи, что и они.

Ребятам из группы *CONTRA LA CONTRA* не позволили надеть майки для выступления, потому что на них были надписи, которые хозяин клуба не хотел видеть. Но мы поговорили с ребятами, они дали нам эти майки и мы надели их. И мы говорили со сцены вещи, которые они не смогли до конца сказать.

